Лидером в играх подряд (без «сухих» поединков) является Игорь Игнатович, забивший по мячу в четырех матчах кряду в 1994 году. Четырежды в трех играх отличались Андрей Орочко, Георгий Татарашвили и Александр Вольский, трижды подряд — Николай Дым и Дмитрий Балашов в 1995 году. И конечно, Олег Герасимчик — в трех турах подряд нынешнего чемпионата.

Александр ЗАХАРЕНКО

БОМБАРДИРЫ, ЗАБИВАЮЩИЕ ПОДРЯД

игрок	забивные матчи подряд	забитые в них мячи	период времени	матчи без голов
А.Мисюк	5 игр	6	07.10.2001–05.05.2002	3
И.Игнатович	4 игры	4	29.09.1994–15.10.1994	0
Ю.Данилевич	4 игры	4	28.04.1996–08.06.1996	1
О.Герасимчик	4 игры	4	13.09.2014–11.10.2014	1
В.Сугако	4 игры	4	09.07.2005–14.08.2005	2
О.Вербицкий	4 игры	4	28.05.2006–24.06.2006	2
Е.Савонь	4 игры	4	12.06.1999–10.07.1999	3
Ю.Данилевич	3 игры	5	01.06.1994–19.06.1994	2
И.Зюлев	3 игры	5	26.08.2006–01.10.2006	3
А.Орочко	3 игры	4	07.05.2014–17.05.2014	0
Г.Татарашвили	3 игры	4	18.04.1999–02.05.1999	0
А.Вольский	3 игры	4	29.09.2002–13.10.2002	0
А.Лужанков	3 игры	4	22.04.2007–13.05.2007	1
И.Срибненко	3 игры	4	10.05.2003–08.06.2003	2
А.Кириевич	3 игры	4	07.06.2008–05.07.2008	2

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

МАЦІ НЯВІННА ПАКАРАНАГА СМЕРЦЮ: «ДЗЯКУЮ БОГУ, ШТО ЎВА МНЕ НЕ ПЕРАМАГЛО ПАЧУЦЦЁ ПОМСТЫ»

У інтэрв'ю сайту Праваабарончага цэнтра «Вясна» Тамара Чыкунова распавяла, як гэта — быць «маці забойцы», чаму яна адмовілася ад помсты за забойства адзінага сына, колькі смяротнікаў засталося ў жывых, дзякуючы працы яе арганізацыі.

Тамара Чыкунова, старшыня ўзбекскай арганізацыі «Маці супраць смяротнага пакарання і катаванняў»

— Тамара Іванаўна, адкуль, пасля перажытай Вамі жыццёвай трагедыі, узяліся сілы для той дзейнасці, якой Вы прысвяцілі наступныя гады — адмены смяротнага пакарання не толькі ў сваёй, але і ў іншых краінах?

— Гэта апошні ліст, напісаны сынам перад расстрэлам. Ён як завяшчанне — каб я жыла і памятала. Мой сын сказаў свайму сукамерніку, што калі я не паспею выратаваць яго, сына, ад смяротнага пакарання, каб той звярнуўся да мяне па дапамогу і яму я абавязкова дапамагу. І так атрымалася, што гэты чалавек быў выратаваны: у снежні 2001-га яму адмянілі смяротнае пакаранне, як і яшчэ аднаму асуджанаму, які праходзіў з ім па справе. Такім чынам, завяшчанне майго сына стала штуршком да таго, каб жыць і працаваць супраць гэтага жорсткага пакарання.

— Якім стала Вашае жыццё пасля расстрэлу сына?

— Я сутыкнулася з тым, што пасля пакарання смерцю сына я засталася ў ізаляцыі. Шмат сяброў проста выпарыліся. Засталіся самыя блізкія. Ды і сваякі ад страху перад такой жорсткасцю перасталі са мной стасавацца. Сам-насам са сваім горам. Я не хацела жыць далей, таму што гэта было маё адзінае дзіця. Гэта была надзея ўсяго майго жыцця — і яе забілі. Навошта жыць? Толькі гэтае жаданне майго сына, каб я жыла і памятала, падтрымлівала мяне. Я стварыла арганізацыю. У яе спачатку ўвайшлі ў асноўным маці асуджаных да смяротнага пакарання. Сярод іх былі жанчыны, дзеці якіх былі асуджаныя, але згубіліся, то бок невядома было, ці жывыя яны, таму што было поўнае маўчанне. Гэтыя жанчыны знаходзіліся паміж небам і зямлёй. Як жыць? Для грамадства яны сталі ізгоямі, іх не разумелі, не разумелі іх гора. Бо яны — маці забойцаў. Таксама ставіліся і да мяне. Калі мяне хацелі абразіць, казалі «яна ж маці забойцы». Пры гэтым ніхто не хацеў разабрацца, як усё адбылося, за што забілі майго адзінага сына, чаму яго так хутка расстралялі, чаму быў неправасудны суд, чаму не было праведзена расследаванне аб катаваннях... Усё гэта не хвалявала грамадства. Галоўнае — як яны лічылі — «аднаўленне справядлівасці». Мой сын быў прызнаны невінаватым у інкрымінаваных яму дзеяннях, былі прызнаныя катаванні і здзекі з яго, неправасудны прысуд, парушэнне права на абарону — але ён расстраляны. Страшна тое, што смяротнае пакаранне незваротнае. Але я нясу крыж маці забойцы ў вачах грамадства. Я не магу ўсім і кожнаму растлумачыць, што я ні ў чым не вінаватая, нават калі мой сын злачынца. Я не адзяляю свайго сына, нявінна расстралянага, ад тых пакараных, хто быў вінаваты ў злачынствах. Я кажу, што нельга забіваць, апраўдваючы сябе законам. Гэта супраць жыцця чалавека. І ўсе мы нясем за гэта адказнасць.

— Што б Вы сказалі маці расстраляных і асуджаных да смяротнага пакарання ў Беларусі?

— Ім бы я хацела сказаць: я з вамі. Я разумею ваш боль. Я на сабе адчула тое негатыўнае стаўленне грамадства да маці асуджаных да смяротнай кары. Але вы — не вінаватыя. Вы павінны памятаць, што вы — маці. І вы маеце поўнае права абараняць сваіх дзяцей. І вы сталі ахвярай гэтага жудаснага закона аб смяротнай кары. Вы — ахвяра. Але вы ні ў чым не вінаватыя. Грамадства вінаватае ў тым, што ў вас адабралі самае дарагое — жыцці вашых дзяцей.

— Тамара Іванаўна, даводзілася чуць, што зняволеныя ў камерах смяротнікаў, па чыіх справах Вы працавалі, называлі Вас маці. Распавядзіце, як вялася гэтая праца. Ці маглі Вы сустракацца з імі?

— У падвале смяротнікаў, у спецыяльна адведзеным пакоі, я была адзін раз — на спатканні з сынам. Я не сустракалася асабіста ні з адным прыгавораным да пакарання смерцю, па справах якіх я працавала. Яны пісалі мне лісты і ў ліставанні называлі мяне маці. Таму што лічылі, што ў першую чаргу маці становіцца на абарону сваіх дзяцей. Таму і наша арганізацыя носіць такую назву — «Маці супраць смяротнага пакарання і катаванняў». Першапачаткова, вядома, прыходзілі маці, прасілі дапамогі. Але ў арганізацыі таксама ёсць і бацькі, і маладыя валанцёры — усе, хто неабыякавы. Яны рабілі вельмі шмат, падтрымліваючы нас, праводзілі маніторынг. Мне адзінай, як кіраўніку арганізацыі, было дазволена рабіць невялікія грашовыя пераводы ўсім прыгавораным да смерці. Такім спосабам мы адсочвалі, хто жывы, а каго ўжо няма (калі перавод вярнуўся), і затым дамагаліся, каб нам далі інфармацыю. Таму што ва Узбекістане, як і ў Беларусі, смяротныя прысуды выконваліся таемна, дата расстрэлу не паведамлялася. Гэта страшэннае катаванне — кожны дзень чакаць смерці.

Вядома, гэтая праца для мяне была нялёгкай. Я два гады не спала. Мяне раздзіралі супярэчлівыя пачуцці: з аднаго боку — жаданне помсціць, з другога — разуменне, што, паддаўшыся гэтаму жаданню, я стану на шлях злачынства. У мяне не было спакою. Я не знаходзіла сабе месца, таму што калі расстрэльвалі то аднаго, то другога, па справах якіх я працавала, мне хацелася ўсё кінуць, таму што я зноў і зноў праходзіла праз смяротнае пакаранне. І я вымушаная была размаўляць са сваякамі пакараных — гэта мяне дабівала. Але быў і іншы момант. Асуджаныя да смяротнага пакарання даверылі мне свае жыцці з надзеяй, што я змагу іх абараніць, сысці з гэтай працы — значыць здрадзіць ім. Здрады я сама сабе дараваць не змагу. І, адумаўшыся, я пачынала працаваць далей. Я дзякую Богу, што ўва мне не перамагло пачуццё помсты. Я вельмі шмат размаўляла са святарамі, і яны накіравалі мяне на шлях праўдзівы. Гэта шлях праз дараванне. Я даравала ўсім тым, хто забіў майго сына, і ўсім, хто жыве ў дзяржаве, якія часцяком падтрымлівалі гэты жудасны закон аб смяротнай кары. І я стала спаць, у маёй душы запанаваў мір. І ў мяне стала больш атрымлівацца ў працы. Я стараюся з дабром ставіцца да людзей. І ў гэтым выпадку было дабро ў дачыненні да сябе самой: не помсціць, а жыць. Жыць, ратуючы жыцці іншых людзей.

—Колькі жыццяў Вам удалося выратаваць ва Узбекістане?

— Непасрэдна асуджаных да смяротнага пакарання было 98 чалавек. 58 заставаліся ў камерах смяротнікаў на дзень юрыдычнай адмены смяротнага пакарання — 1 студзеня 2008 года. Пазней мы дамагліся, каб да іх крымінальных спраў паставіліся не фармальна, а перагледзелі кожную. Гэта быў прэцэдэнт сусветнага маштабу. Таму што ёсць такая практыка: усе раней асуджаныя да смяротнага пакарання альбо расстрэльваюцца напярэдадні адмены смяротнага пакарання ці мараторыю, альбо іх аўтаматычна пераводзяць на пажыццёвае пазбаўленне волі. Практыка ва Узбекістане даказала, што не настолькі ўсе былі вінаватыя. З 58 чалавек, пасля перагляду Прэзідыумам Вярхоўнага суда іх крымінальных спраў, толькі 12 пайшлі на пажыццёвае пакаранне. 46 чалавек атрымалі розныя тэрміны пакарання з правам выйсці на свабоду, то бок быць памілаванымі праз 15 гадоў. Важнае нашае дасягненне, што да юрыдычнай адмены смяротнага пакарання, з 2001-га па 2008-ы, 23 чалавекам смяротныя прысуды замянілі рознымі тэрмінамі ў выніку перагляду іх крымінальных спраў. 22 з іх ужо на волі. І я ганаруся гэтымі хлопцамі. Ні адзін з іх не помсціць грамадству, якое прыгаварыла іх да смерці. Яны ўсе сталі годнымі чальцамі грамадства — працуюць, ажаніліся, гадуюць дзяцей. І ў кожным з іх я бачу свайго сына, незалежна ад узросту і нацыянальнасці.

— Закон аб адмене смяротнага пакарання ва Узбекістане, у распрацоўцы якога Вы ўдзельнічалі, называюць адным з самых прагрэсіўных. На што варта звярнуць увагу ў гэтым законе?

— У гэтым законе для былых вязняў камеры смяротнікаў ключавымі з'яўляюцца тры пункты: доступ да медыцыны, права на працу і права на вучобу. Таксама важная для іх магчымасць — не парываць з сем'ямі, раз на месяц ім дазволеныя званок сваякам і спатканне, яны могуць атрымліваць бандэролі ад сваякоў. Калі яны досыць зарабляюць, то абавязаныя дапамагаць сем'ям ахвяраў іхніх злачынстваў. Гэта асновы закона. То бок мэта — выпраўленне і падрыхтоўка да выхаду на волю, рэсацыялізацыя.

— Каб прыйсці да адмены смяротнага пакарання ва Узбекістане, у Вас з аднадумцамі сышло восем гадоў. Што, на Вашу думку, дазволіла дамагчыся пастаўленай задачы?

— Ведаеце, у Сэнт-Экзюперы ёсць «Малітва», якая пачынаецца радкамі: «Госпадзе, я прашу не пра цуды і не пра міраж, а пра сілу кожнага дня. Навучы мяне мастацтву маленькіх крокаў...». Гэта азначае «навучы мяне дыялогу». Шлях маленькіх крокаў у мяне пачаўся з Абшчыны Святога Эгідзія, з якой я пазнаёмілася ў 2002 годзе. І вось ужо больш за 12 гадоў гэтыя хрысціяне поруч са мною. Яны жывуць у розных краінах свету, але адзінай іх мэтай з'яўляецца шлях да міру і тварэння. І першая з задачаў гэтай грамадскай арганізацыі — адмена смяротнага пакарання. Яны вельмі шмат працуюць па краінах, дзе ёсць смяротнае пакаранне. Яны былі ініцыятарамі Сусветнай кааліцыі супраць смяротнага пакарання. Кааліцыя была заснавана 13 траўня 2002 года ў Рыме, у офісе Абшчыны Святога Эгідзія. І я мела гонар удзельнічаць у гэтым пасяджэнні і з'яўляюся адной з першых удзельніц Сусветнай кааліцыі супраць смяротнага пакарання.

Вяртаючыся да шляху маленькіх крокаў, хачу сказаць, што ажыццяўленне нашай задачы давалася складана. Не ўсе разумелі мяне. І не варта скідаць з рахункаў, што Узбекістан — на 90% мусульманская дзяржава, а я — жанчына, хрысціянка, руская, грамадзянка Расіі. Не ўсе праваабаронцы падтрымлівалі мяне ў барацьбе за адмену смяротнага пакарання. Але часам вельмі простыя людзі дапамагалі хто як можа, не застаючыся абыякавымі да гэтай праблемы. Як правіла, яны прыходзілі да нас разам са сваякамі асуджаных да смяротнага пакарання і заставаліся валанцёрамі. І іх неабыякавасць нам дапамагала яшчэ выйграваць працэсы. Затым з 2005 года мы пачалі весці растлумачальную працу з рознымі слаямі насельніцтва. Мы хадзілі ў розныя аўдыторыі — да студэнтаў, да афганцаў, напрыклад, і ў сваіх выступах, праз асабістыя сведчанні, казалі пра тую жорсткасць, якая заахвочваецца грамадствам. І людзі слухалі нас сэрцам, і да іх прыходзіла разуменне праблемы. Пасля дыскусій заўсёды былі людзі, якія змянілі сваё меркаванне ў бок адмены смяротнай кары. І калі сярод ста чалавек такіх набярэцца двое — вы ўжо перамаглі. Таму што сёння яны зрабілі выбар для сябе, заўтра дапамогуць зрабіць гэты выбар свайму сябру, таму што яны ўжо праінфармаваныя.

Але зразумела, што адмена смяротнага пакарання — гэта палітычная воля кіраўніка дзяржавы. Для таго, каб кіраўнік дзяржавы нас пачуў, мітынгі і пратэсты не дапамаглі. Значна больш станоўчых вынікаў нам прынёс дыялог — гэта доўгі шлях. І першым крокам дыялогу была сусветная акцыя за адмену смяротнага пакарання ва Узбекістане, калі журналісты наўпрост спыталі прэзідэнта Карымава пра яго стаўленне да смяротнага пакарання — як чалавека і як прэзідэнта. Ён задумаўся, а затым адказаў: «Як чалавек, я супраць гэтага пакарання, але як прэзідэнт я адкажу вам пазней». Гэта быў першы крок дыялогу. Не будзе выніку, пакуль супрацьстаяльныя бакі не сядуць за стол перамоваў і не пачнуць размаўляць — крок за крокам.

https://spring96.org

СПОВЕДЗЬ

Зорачка мая ясная...

МАЛЮНАК ЯЎГЕНА ІВАНОВА

Гэта было ў далёкім дзяцінстве. Тады вясковыя дзеці рэдка адпачывалі ў піянерскіх лагерах. Сапраўднай прычыны я не ведаю: ці то пуцёвак на сельскія школы выдзялялі мала, ці то бацькі не пускалі, бо летам дома было процьма рознай работы: жывёлу пасвіць, агарод палоць, на калгасных дзялках бацькам дапамагаць. Ды ўсяго і не пералічыш. Але мне і Тані нечакана пашанцавала: нам выдзелілі пуцёўкі, і бацькі адпусцілі ў піянерскі лагер на беразе цудоўнага возера. Колькі было радасці! (Каб толькі ведаць, што гэта радасць абернецца потым вялікай бядой.)

Нас размеркавалі па розных атрадах, бо Таня была на год маладзейшай за мяне, але аднойчы нас разам павялі купацца. Дзень быў сонечны, ласкавы, вада цёплая. Мы пад наглядам выхавальнікаў плавалі, гулялі. Я схапіў на беразе невялікі круглы каменьчык і шпурнуў яго ў ваду. Да гэтага часу не зразумею, як пад яго падкруцілася Таня. Каменьчык той трапіў ёй проста ў вока…

Дзяўчынку адразу ж завезлі ў абласную бальніцу, потым у Мінск. Як дактары ні стараліся, а вочка выратаваць не ўдалося. І засталася яна сляпая на ўсё жыццё. Ці варта казаць, як мяне мучыла сумленне, як я пакутаваў!

Калі Таня выпісалася з бальніцы, я пайшоў прасіць прабачэння. Мае бацькі раней ездзілі да яе ў сталічную бальніцу. І калі ў бальніцы Таня з імі размаўляла спакойна і ветліва, казала, што крыўды на мяне не мае, бо я ж не хацеў такога дзікага здарэння, то дома ўсё было інакш. Яе мама не пусціла мяне нават на парог.

—Акалечыў дзяўчынку ды яшчэ прыйшоў на яе паглядзець! — са злосцю крычала цётка Настасся. — Хіба ў сабакі вачэй пазычыў?! Вон, і каб духу твайго тут не было!

Яна вырвала з маіх рук букет палявых кветак, што я назбіраў для Тані, і адхвастала імі мяне па твары, а потым шпурнула ўслед.

Ад абразы і крыўды я пабег у недалёкі лес і плакаў там да таго часу, пакуль не заснуў. Праспаў да самай раніцы. А мае няшчасныя бацькі з ног збіліся, шукаючы мяне. Баяліся, каб чаго дрэннага з сабой не зрабіў. Але ўчастковы параіў ім пачакаць да раніцы і сказаў, што як не прыйду, то ён наладзіць пошукі.

Раніцай, калі выганялі ў поле каровы, Таніна мама радасна казала вясковым кабетам:

—Такі ёсць Бог на свеце! Збаёдаў сябе гэты бандыт. Відаць, сумленне замучыла і недзе ў лесе павесіўся. Я ж бачыла, як ад нас пабег да лесу.

—Пасаромелася б ты, Настасся, — паўшчувала яе наша суседка Вера. — Хіба ж ён знарок акалечыў Таню? Хлопец так перажывае! Цяпер што, усё жыццё будзеш яго праклінаць ды папракаць?

—І буду! — крычала з нянавісцю. — І пракляну. Бацькі яго таксама прыйшлі на тым тыдні прасіць прабачэння, дапамогу ўсякую прапаноўвалі, то я так шуганула, што ледзь дарогу дадому знайшлі.

—Ведаем пра гэта, — махнула рукой цётка Вера і пайшла сваёй дарогай. Не хацелі слухаць абвінавачванні і праклёны нашай сям'і і іншыя вясковыя кабеты.

Таня доўгі час не выходзіла з дому, але як пачаўся навучальны год, разам з усімі пайшла ў школу. Яна пачала вучыцца ў шостым, а я ў сёмым класе. Пасля ўрокаў кожны дзень пільнаваў яе ў школьным двары, каб паднесці партфель з падручнікамі, распытаць, як прайшлі заняткі. І з радасцю бачыў, што ёй прыемна, што яна, выйшаўшы з дзвярэй, шукае мяне поглядам.

—Ты адвяжашся, бандыт, ад маёй дачкі ці не? — убачыўшы нас разам, на ўсю ваколіцу закрычала цётка Настасся. — Мала таго, што знявечыў? Калі яшчэ раз убачу побач з Таняй, сама табе вока выб'ю. Я і бацькам тваім так сказала.

Побач з цёткай Настассяй стаяў і яе муж Андрэй, але ён і не спрабаваў спыніць жончыны праклёны, якія ляцелі на маю галаву. Значыць, і ён быў з ёю заадно.

З таго дня я перастаў падносіць Танін партфель, але мы з ёй сустракаліся ў школьных калідорах і гутарылі пра ўсё на свеце, кожны раз радаваліся такой сустрэчы, як найвялікшай падзеі.

Ішлі гады. Мы выраслі. Варожасць паміж нашымі бацькамі нікуды не знікла, і мая мама пачала сварыцца з цёткай Настассяй.

Мы з Таняй у адзін год скончылі школу, бо тады выпускаліся адначасова дзясяты і адзінаццаты класы. Бацькам праўды не сказалі, куды будзем паступаць, каб не выклікаць яшчэ большай варожасці і розных непатрэбных размоў. Паехалі ў далёкі горад і паступілі ў педагагічны інстытут. Праўда, потым Таніна мама даведалася, але што яна ўжо магла зрабіць, калі мы сталі студэнтамі.

Аднойчы мы з Таняй ішлі па ўзбярэжжы ракі, што ўпрыгожвае сваімі срэбнымі водамі горад, дзе мы вучыліся. Аднекуль даносілася песня:

Зорачка мая, ясная мая,
Ты заўжды са мною…

—І ты мая зорачка!.. — прыхінуўшы дзяўчыну да сябе, усхвалявана сказаў я. — Давай пажэнімся і разам паедзем працаваць, бо неўзабаве ж размеркаванне.

—Я згодна. Але як жа бацькі?

—А што бацькі? Калі не могуць за столькі гадоў перамагчы ў сваіх сэрцах варожасць, то хай як хочуць…

Неўзабаве мы распісаліся. У студэнцкім інтэрнаце зрабілі невялікае застолле.

У родную вёску не ездзілі, хоць пісалі пісьмы і званілі рэгулярна. З вялікай радасцю паведамілі бацькам, што яны ўжо сталі дзядулямі і бабулямі, што наша маленькая Жанначка таксама шле ім прывітанне. І якое ж было здзіўленне, калі аднойчы надвячоркам да нас прыехалі дарагія госці — нашы з Таняй бацькі. Прыехалі разам. Мы з жонкай вельмі рады, што насуперак усяму адстаялі сваё шчасце…

З пашанай, Станіслаў Іванавіч

Да друку падрыхтавала Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

ЗДАРЭННІ

ТРАГІЧНАЯ КАЛЯЯ МАСТОЎШЧЫНЫ

Чыгуначная станцыя ў Мастах

Цягам апошняга года на Гарадзеншчыне адбылося 6 няшчасных выпадкаў на чыгунцы. З іх тры са смяротным зыходам, у тым ліку адно самагубства.

Першыя тры здарэнні прыпадаюць на станцыю Масты, два — у межах самой станцыі. Усе пацярпелыя не мастаўляне: двое гамяльчан і адзін жыхар Гродна.

Лік трагедыям увесну адкрыў гамяльчанін, які знаходзіўся ў Мастах у камандзіроўцы. Ён паспяшаўся сесці на адыходзячы цягнік Гродна — Гомель, але трапіў пад яго колы. Праз некалькі дзён мужчына памёр у аддзяленні рэанімацыі мясцовага ТМА.

Напрыканцы жніўня трагічна закончылася паездка ў Масты 61-гадовага гродзенскага пенсіянера, які штодня прыязджаў сюды да сваякоў дапамагаць будаваць дом. Выйшаўшы з дызель-цягніка, ён не заўважыў манеўровы лакаматыў, што рухаўся па суседняй калеі і не звярнуў увагі на сігналы машыніста. Ад атрыманых у выніку сутыкнення ран памёр.

Некалькі дзён таму была ўстаноўлена асоба пацярпелай, што была знойдзена мёртвай ля прыпыначнага пункта Дубна. Ёй аказалася 34-гадовая жанчына, што напярэдадні вызваліся з месца пазбаўлення волі і збіралася пахаць у Гродна. Відавочцы бачылі яе ў той дзень апоўначы на а.п. Чарлёна. Прычына смерці — траўмы, атрыманыя ад сутыкнення з цягніком.

Язэп ПАЛУБЯТКА

НОВОСТИ

ОНИ ЗАДОЛЖАЛИ СВОИМ РАБОЧИМ ПО ЗАРПЛАТЕ

В Гродненской области два предприятия — КСУП «Совхоз «Первомайск-Агро» и коммунальное проектно-изыскательное унитарное предприятие «Гродносельстройпроект — имеют задолженность по заработной плате, сообщает Белстат.

Всего в Республике Беларусь на 1 октября 2014 г. в 222 организациях имелась просроченная задолженность по заработной плате перед 33,8 тыс. работников. Сумма просроченной задолженности составила 123,3 млрд. рублей, или 0,7 процента от фонда заработной платы по республике за август 2014 г.

Анна ВОЛОДАЩУК

В ГРОДНЕНСКОЙ ОБЛАСТИ БОЛЕЕ 10 ТЫСЯЧ ГРАЖДАН СДАЮТ ВНАЁМ СВОЁ ЖИЛЬЁ

В налоговых органах Гродненской области состоит на учете 10 528 граждан, сдающих внаем дома, квартиры, комнаты. В сравнении с аналогичным периодом прошлого года их число возросло на 1 029, а сумма поступлений увеличилась на 5,1 млрд. рублей.

Из указанного количества плательщиков 542 зарегистрированы в качестве индивидуальных предпринимателей, которые осуществляют сдачу внаем жилых помещений на часы и сутки, сообщает пресс-центр Министерства по налогам и сборам Республики Беларусь.

Только в текущем году налоговыми органами Гродненской области в отношении данной категории плательщиков выявлено более 180 фактов нарушений налогового законодательства, из них около 90% выражены в неуплате налогов.

Анна ВОЛОДАЩУК

ЧЕМ ГОТОВ РИСКНУТЬ ЧИНОВНИК РАДИ КАРЬЕРНОГО РОСТА?

Довольны ли белорусские госслужащие своей работой и зарплатой и за что не любят свое начальство?

Чиновники рассказали, как они относятся к существующей системе и что думают о реформе государственного аппарата — по заказу информационного офиса «Беларусь в фокусе» проведено исследование «Белорусский госсектор: ценности, ожидания и восприятие реформ».

Исследование включало 12 фокус-групповых дискуссий от 8 до 10 участников в каждой: представителей государственных предприятий и государственных служащих среднего и низшего управленческого звена, прочих профессий и сфер деятельности. География исследования — жители Минска, Гродно, Бреста, Могилева, Бобруйска, а также городское население Гомельской и Витебской областей.

СОКРАЩЕНИЙ ЧИНОВНИКИ НЕ БОЯТСЯ

Выяснилось, что занятые в госсекторе высоко ценят социально-экономическую «стабильность»: отсутствие риска увольнения, стабильную достойную заработную плату, уважительное отношение к их труду со стороны начальства. Исключение составляет лишь крайне небольшая группа в основном молодых людей. Они готовы пожертвовать стабильностью ради увеличения уровня дохода.

— Для руководящих сотрудников госпредприятий стабильное место работы важнее, чем возможность повышения дохода. Это делает их «заложниками» работы на государство. А вот чиновники считают себя незаменимыми специалистами, на которых есть спрос, — отмечает один из авторов исследования аналитик Белорусского института стратегических исследований Александр Автушко-Сикорский.

Чиновники уверены: даже если и лишатся кресла, то так или иначе смогут найти работу в другом ведомстве или в частном секторе.

«Я могу из этой сферы в другую пойти — и поэтому мне не страшно. Сокращения как бы не предвидится, но я готова к этому», — ответила на неудобный вопрос во время дискуссии в фокус-группах госслужащая Наталья.

Впрочем, чиновники в малых городах крепче держатся за свое место, чем в крупных. Ведь они имеют достаточно хороший уровень жизни по сравнению с остальным населением. Да и статус их выше, а другую работу найти в провинции сложно.

ПРЕСТИЖ УПАЛ. ДА И ЗАРПЛАТА «НЕ ОЧЕНЬ»

Сократить избыточные полномочия госслужащих — так недавно определил глава государства Александр Лукашенко следующий шаг в реформе системы госуправления, отметив успешность первой фазы — уменьшения количества чиновников.

Однако сами чиновники недавнее сокращение госаппарата почти не заметили — оно прошло для них безболезненно: кто хотел, тот ушел, смог устроиться.

«Если и были сокращения, то либо предлагали равнозначную должность, либо были выплаты какие-то, которые устраивали людей», — охарактеризовала изменения структуры госаппарата участница одной из фокус-групп.

На самом деле нередко сокращались вакансии, некоторые сотрудники перешли в другие ведомства или даже были повышены в должности. Оставшихся работать в госаппарате не устраивает лишь повышение нагрузки: работу, которую «раньше делали несколько человек, теперь приходится выполнять одному».

А что касается избыточных полномочий, то в отличие от руководителей госсектора, для которых то, что они делают, «просто работа», чиновники действительно чувствуют свой особый статус».

— Свою профессию чиновники воспринимают как общественно важную и значимую, — отмечает второй автор исследования, аналитик BISS Елена Артеменко.

Однако уровень своих доходов госслужащие считают недостаточным в сравнении с частным сектором.

«Лет 10 назад на госслужбу у нас было престижно попасть. Зарплаты были, в принципе, нормальные, как-то благодарности были конкретные. Но с годами все поменялось. <...> Заработная плата на уровне республики — мало то есть получаем. В реальном секторе экономики мы же знаем, как замы директоров, директора предприятий зарабатывают там, это на порядок выше», — поделилась наболевшим участница одной из дискуссий Наталья.

И чиновники, и сотрудники госпредприятий указывают на низкие возможности для реализации собственных способностей и творческого потенциала на работе: «инициатива наказуема».

Чиновники не могут высказать свое мнение и повлиять на изменения, которые им приходится внедрять в работу, поскольку управленческие решения в системе госслужбы «спускаются сверху» без учета опыта кадров и локальной специфики.

«Это формирует определенный уровень фрустрации относительно их социального положения», — делают вывод исследователи.

КРЕСЛА ТОЛЬКО ДЛЯ «СВОИХ»

По оценке экс-депутата Палаты представителей Национального собрания Ольги Абрамовой, госаппарат страны строится на кровнородственных связях, широком круге взаимовыгодных услуг в различных ведомствах и лояльности. Эксперт убеждена: не желая терять годами нарабатываемые и внедряемые в сферу цепочки «своих» людей, чиновники не будут предпринимать попытки изменить систему госуправления.

Участники фокус-групп тоже часто говорили о существовании клановости и кумовства в госаппарате, что затрудняет приход на работу людей «со стороны». По их мнению, переезжать в другой город крайне затруднительно из-за того, что некому оказать поддержку на новом месте, а сотрудник даже с высокой квалификацией никому не нужен из-за отсутствия связей.

Кроме того, карьерный рост зачастую упирается в то, что начальник «сидит до конца» даже после пенсии.

ПОЖЕРТВОВАТЬ СТАБИЛЬНОСТЬЮ РАДИ КАРЬЕРЫ?

Что такое реформы, чиновники понимают по-своему: не как преобразования с определенными целями, а как постоянный процесс изменений законодательства и условий функционирования госаппарата, к которым им все время приходится адаптироваться.

— Умение приспосабливаться к новым условиям они воспринимают как профессионализм, но отмечают, что это отнимает много времени и усилий, — говорит Елена Артеменко.

Некоторые участники дискуссий упоминали, что постоянно меняется законодательство. И пока по цепочке сверху вниз доведут до работников, что эти изменения означают, нижнее звено работает на свой страх и риск. По их мнению, вышестоящие органы, принимая решение об изменении процедур, не понимают, что происходит на нижнем уровне, и мешают работать.

Одна из целевых групп проекта «Реформум», который является возможностью и площадкой для налаживания контактов и установления взаимопонимания между государством и независимыми экспертами, — власть.

Исследование «Белорусский госсектор: ценности, ожидания и восприятие реформ» позволило определить, как чиновники видят реформы и как относятся к ним. Ведь зачастую реформы не внедряются или не работают из-за сопротивления на уровне функционеров в госаппарате. Какие реформы их не напугают?

— Сотрудники госсектора могут позитивно отреагировать на меры, повышающие их «уверенность в завтрашнем дне»: внедрение обучающих программ, долгосрочных контрактов, расширение социальных программ, — считает Александр Автушко-Сикорский.

По его мнению, занятые в госсекторе могут позитивно отнестись к внедрению системы найма и продвижению по службе, основанной на достижениях и заслугах (result-oriented management), а не на клановости и кумовстве.

— Для чиновников более привлекательно выглядят изменения в госуправлении, учитывающие специфику работы на нижнем и среднем уровнях, а также мнение работников на местах, — считает аналитик BISS.

Исследователи также полагают, что чиновникам должны быть предложены меры, исправляющие дисбаланс «нагрузка — зарплата» при должностном повышении: дебюрократизация и снижение рабочей нагрузки и/или больший рост заработной платы, а также повышение престижа профессии.

Алина МАШКОВА,
«Завтра твоей страны»

Доброе утро, Слоним!

Задумываемся ли мы когда-нибудь над ценностями нашей жизни и чего стоит этот бесценный дар?

Если родители не вложили нам с рождения этот глубокий смысл или в ДНК у них не было такой информации, тогда мы, как и многие, чувствуем себя властелинами жизни. Начинаем делить жизнь на два спектра — белый и черный. Постепенно срастаемся с этим тезисом и, размышляя, говорим: "Все так живут…»

Остановитесь с этим «как все…». Посмотрите, как встает алое солнце. Прислушайтесь, как курлычут, улетая, журавли. Всмотритесь в безмятежное лицо ребенка — это дорогие моменты жизни, запечатлевающие мгновения прекрасного, неповторимого ритма бытия. Лучше для нас сделать своевременно «переоценку» ценностей, а в её шкале понизить статус материального и видимого — и повысить важность личности с её участием в процессе жизни. Важно научиться дорожить временем и совершать остановки для глубокого анализа своей жизни: зачем мне дана жизнь? Как я обязан ею распоряжаться? Как я сам могу повлиять на ритм жизни? Лежит ли на мне ответственность за то, как я живу?

Если мы сможем искренне ответить себе на эти вопросы, тогда сможем сказать:

— Нет, не напрасно я живу, дышу и существую. Жизнь прекрасна!

Алёна АЛЬКО

АБ ПРАЎДЗЕ ЎСЁ ПАПРАЎДЗЕ

Сведка пакляўся суду на Біблії “казаць праўду і толькі праўду” і тымі словамі схлусіў.

Самая праўдзівая праўда ў чыноўнікаў.
Ад п’янай праўды сінякі пад вачыма.
Не блытай маю праўду са сваёю.
Праўда адна, ды ў кожнага розная.
Праўдай сыты не будзеш.
Дастаў сваёй праўдай.
Пайшоў ты са сваёй праўдаю.
Каб ты толькі чуў тую праўду.
Ад праўды нідзе не схаваешся.
Ад тваёй праўды ні горача ні холадна.
Каб ты жыў з тою праўдаю.
Калі настане тая праўда?
—Пішы, кажы сваю праўду — наша праўда праўдзівейшая, — адказаў чыноўнік наведвальніку.
Праўда ў праўдзе — а суддзі хто?
Хочаш сапраўднай праўды, запытай ва Усявышняга, ці быў справядлівы ў Садоме і хто адкажа за Гамору?
Праўда як справядлівасць — у кожнага свая.

Язэп ПАЛУБЯТКА

АФИША СПОРТИВНОЙ НЕДЕЛИ

18 октября. Футбол. 25-й тур. Чемпионат Беларуси. Первая лига. ФК «Слоним» — ФК «Лида». Стадион «Юность». **Начало в 15.00.**

19 октября. Футбол. Юношеское первенство Беларуси среди 1997 и 1999 гг. рождения. ФК «Слоним» — «Волна» (Пинск). Стадион «Газпром трансгаз Беларусь». **Начало в 13.00 и 15.00.**

Заглянем в семейный альбом

Дорогие читатели! С сегодняшнего номера мы открываем в газете новую рубрику — «Заглянем в семейный альбом». Если у вас сохранились старые семейные фотографии с интересной историей, мы с удовольствием поместим их и ваши рассказы-истории на страницах «Газеты Слонимской».

Редакция

ТЕПЕРЬ ТОЙ ДЕВЧОНКЕ НА ФОТОГРАФИИ — ЗА ВОСЕМЬДЕСЯТ

Знакомая женщина пожилых лет очень гордится фотографией военных времен. Ей тогда было лет десять-двенадцать. Может, меньше или чуть больше, сама не знает. На фото она, самая юная, две её старшие сестры и сидящая на стуле мама, поджавшая босые ноги. У мамы затравленный, почти испуганный взгляд. Зато девчонки смотрят открыто и спокойно в объектив фотоаппарата. Без опаски. Да еще из-за плеч выглядывает бабушка, почти незаметная. Но главное — они четверо.

Фотографировал немец, антифашист. По словам женщины, он любил собрать вокруг себя простых людей и, оглядевшись по сторонам, не видно ли других немцев или полицаев, рассказывал о положении дел на фронтах. Что войска гитлеровцев так и не взяли Москву, что план быстрого покорения русских провалился, что скверны дела немцев. И вообще, Гитлер капут. То есть рисковал, заявляя подобное, если бы на него донесли. Он был фельдшер, людей лечил, поэтому, видимо, и не боялся.

Слонимчанка Полина Щербенева (крайняя слева) в детстве со своей семьёй

Квартировал у них. От затяжного плеврита и надрывного кашля вылечил одну из сестер женщины. И все же она хотела его убить, с гордостью вспоминает рассказчица. Когда ложился вздремнуть, то клал пистолет с кобурой на табурет рядом. Она вытаскивала пистолет, направляла на голову спящего, жала на курок. Но немец ставил пистолет на предохранитель, а обращаться с оружием она не умела.

Прошли годы. Она получила высшее образование, прочитала книги о войне, в том числе и о немецких антифашистах. Давно поняла, что стыдиться этой фотографии не надо, пусть и сделана немцем. А вот смотреть, разглядывая себя совсем юную, приятно. Так что если бы не тот немецкий фельдшер…

Теперь ей за восемьдесят. Мальчишеская стройность на фотографии давно утрачена. Но она берет в руки фотографию, разглядывает себя, сестер, ещё нестарую маму, и кажется, что всё ещё впереди, все горести и радости, которые будут в большой и трудной жизни.

Зовут женщину Полина Щербенева. Снимок сделан в селе Пичевка Могилевской области в конце лета 1942 или 1943 года. Полина на фото слева, самая юная.

Владимир ШУМЕЛЬ

АФИША

КИНОТЕАТР «МИР»

15 октября

Зал — «Люди Икс», США, фантастика, боевик, сеансы в 17.20 и 20.00

Видеосалон — «Охота на ведьм», США, ужасы, сеансы в 16.00, 18.00 и 20.00

16 октября

Зал — «Люди Икс», США, фантастика, боевик, сеансы в 17.20 и 20.00

Видеосалон — «Охота на ведьм», США, ужасы, сеансы в 16.00, 18.00 и 20.00

17 октября

Зал — «Красавица и чудовище», Франция, фэнтези, мелодрама, сеансы в 17.30 и 20.00

Видеосалон — «Охота на ведьм», США, ужасы, сеансы в 16.00, 18.00 и 20.00

18 октября

Зал — Детский фильм «Незнайка на Луне», Россия, мультипликация, сеанс в 14.00; «Красавица и чудовище», Франция, фэнтези, мелодрама, сеанс в 16.00. Детская дискотека, начало в 18.00

Видеосалон — «Охота на ведьм», США, ужасы, сеансы в 16.00, 18.00 и 20.00

19 октября

Зал — Детский фильм «Незнайка на Луне», Россия, мультипликация, сеанс в 14.00; «Красавица и чудовище», Франция, фэнтези, мелодрама, сеансы в 17.30 и 20.00

Видеосалон — «Охота на ведьм», США, ужасы, сеансы в 16.00, 18.00 и 20.00

ТЕАТР

19 октября

Для детей — спектакль «Морская невеста», начало в 12.00, цена 20 000 руб.

Для взрослых — «Тустеп на фоне чемоданов», начало в 17.00, цена 40 000 руб.

Апавяданне

Шлях да Бога

Дзядуля Максім і ўнук Алесь стаяць побач і моляцца перад іконай.

— Ойча наш нябесны! Свяціся імя Тваё, прыйдзі валадарства Тваё ды станься воля Твая як у небе, так і на зямлі. Хлеба нашага штодзённага дай нам сёння, і выбач нам правіны нашы, як і мы выбачаем вінаватым прад намі, і не дай нас у спакусу, але збаў нас ад злога.

Бо Тваё ёсць валадарства, і сіла, і слава Айца і Сына і Святога Духа, цяпер і ўвесь час, і на вякі вякоў. Амін, — басавіта гудзіць голас дзядулі Максіма.

— Устаўшы ад сну, прыпадаем да Цябе, Добры, і анёльскую песню натхнёна пяём Табе: святы, святы, святы Ты, Божа, Багародзіцай памілуй нас.

Слава Айцу і Сыну і Святому Духу.

Госпадзе, што з пасцелі й сну падняў мяне, прасвятлі розум мой і сэрца маё, і вусны мае адчыні, каб пяяць Табе, Святая Тройца: святы, святы, святы Ты, Божа, Багародзіцай памілуй нас.

І цяпер і ўвесь час, і на вякі вякоў. Амін, — тоненькім галаском выводзіць Алесь.

За акном устае сонца. Чуецца гул машын, даносяцца людскія галасы.

— Неспадзявана Суддзя прыйдзе, і выявяцца ўчынкі кожнага, таму апоўначы са страхам усклікнем: святы, святы, святы Ты, Божа, Багародзіцай памілуй нас.


МАЛЮНАК ЯЎГЕНА ІВАНОВА

Госпадзе, памілуй, — дружна гучаць галасы дзядулі Максіма і Алеся.

На падаконнік села цікаўная сініца. Паглядзела ў акно і моцна засвістала: «Ці-ці-фі, ці-ці-фі…».

— Малітва — гэта шлях да Бога, — кажа Алесю дзядуля.

— А які яшчэ шлях да Бога? — цікавіцца маленькі Алесь.

— Падумай, унучак. Потым, магчыма, сам скажаш мне.

— Я абавязкова падумаю, — абяцае Алесь і, узяўшы партфель, адпраўляецца ў школу.

Са школы Алесь прыходзіць толькі апаўдні.

— Чым парадуеш, унучак? — каля парога сустракае яго дзядуля Максім.

— За гэты тыдзень па паводзінах мне паставілі прыкладную адзнаку, — паведамляе Алесь.

— Малайчына, унучак.

— Дзядуля, гэта таксама шлях да Бога? Так я разумею?

— Так, — кажа дзядуля Максім і ледзь прыкметна ўсміхаецца.

Аляксей ЯКІМОВІЧ

ОТГАДАЙ ЗАГАДКУ — И ВЫИГРАЙ СУВЕНИР!

На головоломку в прошлом номере «Что изображено на загадочной картинке?» все наши читатели, приславшие ответ, увидели изображение коровы или теленка. И это правильный ответ!

Сувениры во вторник были высланы слонимчанам **Юлии, Наталье, Анне Семенович, Татьяне Бусел, а также Екатерине из Жировичей и Александру Пилипчуку из Столинского района Брестской области**.

А вот над следующим заданием придется потрудиться.

ЗАШИФРОВАННЫЕ НАЗВАНИЯ

В четырёх предложениях скрыто четыре названия стран… Какие?

Таксист не ответил, а только усмехнулся: мол, до вашей улицы рукой подать, а вы на машине хотите ехать.

Рыжий котенок-подкидыш на моей кровати разлегся и ждет, когда я принесу дань ему да поиграю с ним в кошки-мышки.

Он осторожно спустился по лестнице, пропуская скрипучие ступеньки, тайком пробрался на кухню и, не включая свет, посмотрел в сад через окно.

Желтеющие листья деревьев вдалеке вычерчивали ровную полоску над полем, и на ее фоне серебристая точка на далеком горизонте вырисовывалась более четко.

Присылайте ответы в SMS-сообщении на номер (8 029) 133-04-21 до 20 октября. Не забудьте указать свое имя, фамилию и домашний адрес, так как сувениры за правильный ответ будут высланы по почте.

На досуге

ШЛЯПА

В магазине была куплена одна шляпа из восьми имеющихся. Определите, какая шляпа.



Старонку падрыхтавала Наталля ІВАНОВА

Наш вернісаж

Дзеці малююць маму

Да Дня маці юныя мастакі гуртка, якім кіруе Яўген Іваноў, падрыхтавалі сваім матулям падарункі — намалявалі іх партрэты.

"Мая мама"
Карына КУР'ЯН,
10 гадоў, СШ №3

"Любай і адзінай маме"
Анастасія НІКАЛАЙЧЫК,
12 гадоў, 6 "А" клас СШ №3

"Мама"
Марыя МАНЮШКІНА,
5 "А" клас СШ №3

"Матуля"
Дзмітрый МАСЛАЎ

РЭДАКЦЫЯ

Намеснік галоўнага рэдактара
Мікола КАНАНОВІЧ
Журналісты
Уладзімір ШУМЕЛЬ
Яўген ВАЛАДАШЧУК
Кацярына ЯНУШЭВІЧ
Таццяна ДЗЕНІСЮК
Алена КАСЦЮК
Стыль-рэдактар
Жанна ПЛЕШКО

Галоўны бухгалтар
Юлія ЛІБІК
Бухгалтар
Вольга БУРСЕВІЧ
Аддзел падпіскі і продажу
Аляксей НАВІЦКІ
8-(029) 322-06-42
Вёрстка і дызайн
Уладзімір КАЧАРГА
Алена ДЗЯТЛАВА

Тэлефоны рэдакцыі:
т/факс: **8 (01562) 5-09-31,**
Тэл. 6-36-58, 6-36-68, 6-36-54, 6-36-44.
МТС: **8-029-584-87-32**
Velcom: **8-029-133-04-21**
Skype — gazslon
(9.00-18.00)
Для карэспандэнцыі:
231799, г. Слонім,
вул. Чырвонаармейская, д. 41
e-mail: gs@gs.by,
gazslon@gmail.com

Рэкламная служба
Начальнік рэкламнай службы
Ганна ВАЛАДАШЧУК
anna@gs.by
8-(029) 612-26-43
Супрацоўнікі
Наталля СТРУПАВЕЦ
Людміла КАМЯНЕЦКАЯ
Наталля СЕМЯНОВІЧ
8-(044) 715-90-03
(9.00–16.00)
т/факс:
8-(01562)-5-09-27

Прыём аб'яў і падпіска:
г. Слонім, Чырвонаармейская, 73 Б
(будынак АРЗ)
Працуем аўторак — пятніца 9^{00}-17^{00}
субота — нядзеля 9^{00}-15^{00}
выхадны — панядзелак
8-(044) 762-48-39

Газета Слонімская
15 кастрычніка 2014 года №43 (906)

погода на неделю

	утро	день	вечер
СРЕДА, 15 октября	14°	15°	12°
ЧЕТВЕРГ, 16 октября	11°	14°	12°
ПЯТНИЦА, 17 октября	9°	8°	6°
СУББОТА, 18 октября	4°	7°	5°
ВОСКРЕСЕНЬЕ, 19 октября	6°	6°	7°
ПОНЕДЕЛЬНИК, 20 октября	10°	11°	12°
ВТОРНИК, 21 октября	9°	11°	9°
СРЕДА, 22 октября	11°	14°	10°

http://www.meteoprog.by

УВАЖАЕМЫЕ ЧИТАТЕЛИ!

Хотите встретить свою вторую половинку, но у вас это не получается? "ГС" поможет вам найти друг друга.

"Давай познакомимся"

Давайте объявление, присоедините свои фото с кратким рассказом о себе. И ваша мечта станет реальностью.

ЖИВОТНЫЕ ИЩУТ ДОМ

КОТЯТАМ НУЖНЫ ХОЗЯЕВА



Двое чёрненьких котят (мальчики) ищут добрых хозяев. Обращаться по тел. 8-029-578-77-68 (Аня).

Светло-рыженький ласковый котенок ищет семью.

Спешите забрать котика себе, и он обязательно станет для вас самым настоящим другом. Обращаться по тел. 8-033-620-40-04 (Оля).

Очаровательных котят (двух мальчиков и двух девочек) отдадут в хорошие руки. Звонить по телефону 8-029-705-17-16 (Ирина).

Татьяна ПЛАХЕТКО

ОСЕНЬ В СЛОНИМЕ ВДОХНОВЛЯЕТ НА ПЕРЕМЕНЫ

Погода нынешней осенью не только радует глаз и греет душу, но и благоволит строителям, облагораживающим Слоним к предстоящим «Дожинкам». В городе, можно сказать, этой осенью жарко… Еще бы, в центре жизнь просто кипит: возрождается парк, строится площадь, обновляются фасады зданий…

Красота спадающей с крон деревьев золотой листвы и тепло солнечных лучей вдохновляют на перемены, а не заставляют этой порой думать о потерях…

Алёна АЛЬКО
Фото автора

Дзякуй за тое, што выбралі "Газету Слонімскую"!

Галоўны рэдактар Віктар Уладзіміравіч Валадашчук, victor@gs.by

ЗАСНАВАЛЬНІК
Віктар Уладзіміравіч ВАЛАДАШЧУК
Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах

Рэгістрацыйнае пасведчанне №64 ад 05.03.2009 года, выдадзена Міністэрствам інфармацыі РБ. Свидетельство о госрегистрации УП "Газета Слонимская" ЮКЛ № 001845, выданное Гродненским областным исполнительным комитетом от 03.04.2003 г.

Юрыдычны адрас: 231800, г.Слонім, вул. Чырвонаармейская, 41

Падпісныя індэксы:
64042 (індывідуальная)
63818 (ведамасная)
63646 (ільготная)
Свабодны кошт

Час падпісання да друку па графіку 14 кастрычніка 2014 года 16:00.
Аб'ём – сем умоўных друкаваных аркушаў.

Надрукавана ў друкарні ГАУПП "Гродзенская друкарня" г.Гродна, вул. Паліграфістаў, 4, індэкс 230025.
Заказ №6099